*жаных берагоў. У яе халоднае люстэрка ўрачыста ўглядаюцца прыбраныя ў белыя футры дрэвы.*

*Першы снег змяніў усё навокал і ўпрыгожыў прыроду, як чараўнік.)*

**5. Арфаграфічная і пунктуацыйная падрыхтоўка.**

Падчас вусных адказаў вучняў звяртаецца ўвага на выкарыстаныя імі сказы з аднароднымі членамі. Тлумачыцца пастаноўка знакаў прыпынку ў гэтых сказах. У апорных спалучэннях слоў настаўнік просіць знайсці словы, у якіх трэба правяраць правапіс парных звонкіх і глухіх зычных (*лёгкім, лёг, шапкамі, стужкай*). Вучні падбіраюць да гэтых слоў праверачныя. Звяртаецца ўвага на словы з падвоенымі літарамі (*ноччу, уецца, углядаюцца*), тлумачыцца правапіс літары ***ў*** у словах.

**6. Напісанне сачынення вучнямі.**

**7. Самаправерка напісанага.**

Настаўнік фіксуе ўвагу вучняў на тым, што неабходна перачытаць напісанае сачыненне двойчы. Пры першасным чытанні трэба прасачыць правільнасць выкладу зместу. Пры другасным — правільнасць напісання слоў, пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах.

**IV. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 109, пытанні для абагульнення на с. 68.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе зрабіць заданне, падобнае таму, што вы рабілі да гэтага ўрока. Акрамя таго, неабходна будзе вусна адказаць на пытанні па тэме «Сказ».

**V. Вынік урока.**

— Да якога тыпу належыць тэкст, які вы склалі і запісалі на ўроку? Якія цяжкасці ўзніклі пры складанні тэксту «Першы снег»? Знайдзіце ў запісаным тэксце сказы з аднароднымі членамі. Прачытайце іх. (Вучні зачытваюць тыя сказы з аднароднымі членамі, якія яны выкарысталі ва ўласных тэкстах.) Якія знакі прыпынку вы паставілі ў іх? Чаму?

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Вітка, В.* Урокі роднага слова : вершы, казкі, апавяданні : для мал. шк. узросту. / В. Вітка; уклад. Т. С. Тарасава; маст. М. Р. Казлоў. — Мінск : Юнацтва, 2001. — 264 с.
2. *Галубовіч, Я.* Дзівосы роднай прыроды : апавяданні і казкі для дзяцей / Янка Галубовіч ; мастак К. Г. Разанкова. — Мінск : Пачатковая школа, 2012. — 168 с.
3. *Дзеружынскі, А. С.* Вяселікі : выбранае : вершы, паэмы, казкі, смешкі, пацешкі, небыліцы, жарты : для малодшага школьнага ўзросту / Авяр'ян Дзеружынскі ; малюнкі А. Лось. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1979. — 318 с.

***Свірыдзенка В. І.,***
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ*

# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## IV клас*

***Дэлегацыя.***

*1. Сярод прапанаваных складоў адшукайце і зафарбуйце тыя, з якіх можна скласці слоўнікавае слова. Злучыце склады так, каб атрымалася слоўнікавае слова.*

[дэ] [цы] [ле] [де] [га] [ци] [я]

*2. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 4 | 1 | 6 | 9 | 3 | 5 | 8 | 2 | 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| е | д | а | я | л | г | ы | э | ц |

*Падкрэсліце літары, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі.*

*3. Дапоўніце сказы слоўнікавымі словамі. Знайдзіце і падкрэсліце асабовы займеннік.*

У Мінск прыехала ______________ з Кітая. Яна наведала Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Гасцям спадабалася галоўная __________ горада — праспект Незалежнасці.

*4. Дапоўніце сказ патрэбнымі словамі.*

Група дэлегатаў, прадстаўнікоў якога-небудзь калектыву, якой-небудзь дзяржавы — гэта ________

Выбраны або прызначаны прадстаўнік якойнебудзь арганізацыі, калектыву, дзяржавы — гэта ________.

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

Білет дэлегата — гэта __________ білет.

Выбраць дэлегатам — гэта значыць __________.

***Словы для даведкі:*** дэлегацкі, дэлегацыя, дэлегат, дэлегаваць.

*5. Прачытайце словы. Устаўце прапушчаныя літары.*

Д..л..гац..я, д..л..гат, д..л..гаваць, д..л..гацкі.

Адзначце правільнае сцвярджэнне.

☐ Запісаныя словы з'яўляюцца аднакаранёвымі словамі.

☐ Запісаныя словы з'яўляюцца формай аднаго і таго ж слова.

***Чацвёрты.***

*1. Разгадайце рэбус, запішыце слоўнікавае слова.*




*Дапоўніце тэкст слоўнікавымі словамі.*

Чацвер — ________ дзень тыдня. Ён з'яўляецца днём, які вызначае нумарацыю тыдняў. Першы тыдзень года вызначаецца як тыдзень, які ўтрымлівае першы ________ года.

***Словы для даведкі:*** чацвер, чацвёрты.

Знайдзіце і падкрэсліце ў тэксце асабовы займеннік. Вызначыце яго асобу, лік, род.

*2. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8 | 2 | 3 | 1 | 5 | 7 | 4 | 6 |
| ы | а | ц | ч | ё | т | в | р |

*Знайдзіце і запішыце займеннік, які «схаваўся» ў слоўнікавым слове. Вызначыце яго асобу і лік.*

*3. Прачытайце словы. Устаўце прапушчаныя літары.*

Ч..тыры, ча..вёрты, ча..вёра, ча..вёрка.

*4. Прачытайце словы.*

Чатыры, чацвёрты, чацвёра.

*Дапоўніце сказ патрэбным словам з прапанаваных.*

Красавік — _________ месяц года.

*5. Перакладзіце словы на беларускую мову.*

Четвёртый — ________________.

Четыре — ____________________.

***Услых.***

1. Разгадайце рэбус. Запішыце слоўнікавае слова, якое атрымалася.




*Падкрэсліце ў слове літары, якія абазначаюць галосныя гукі.*

*2. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

[у] [в] [ы]

[..]сл[..]х

*Дапоўніце тэкст слоўнікавым словам.*

Я часта чытаю кнігі ________ для сястрычкі. Па вечарах Верачка просіць мяне аб гэтым. Са мной сястрычка засынае хутчэй, чым з мамай і татам.

*Знайдзіце ў сказах тэксту асабовы займеннік. Вызначыце яго асобу, лік, склон.*

*3. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.*

Уголас, каб было чутно іншым, — гэта значыць ____________.

Адно з пяці знешніх пачуццяў, якое дае магчымасць успрымаць гукі, — гэта ____________.

Уважліва прыслухацца, стараючыся пачуць, зразумець што-небудзь, — гэта значыць __________.

***Словы для даведкі:*** *услых, услухацца, слых.*

*4. Што абазначае выдзелены выраз у сказе?*

Калі Наталля Пятроўна пачала расказваць пра кнігі, якія нядаўна паступілі ў бібліятэку, вучні **ператварыліся ў слых**.

| пачалі вельмі ўважліва слухаць што-небудзь | замаўчалі |
|---|---|

*Зафарбуйце алоўкам прамавугольнік са значэннем выразу.*

*5. Сярод прапанаваных слоў знайдзіце лішняе, закрэсліце яго.*

Услых, слыхавы, слых, услед, слухаць.

*6. Прачытайце верш. Дапішыце прапушчаныя літары ў слоўнікавыя словы.*

Беглі сцежачкай с..кунды,
Шчабяталі сёстры ..сл..х, —
Выхваляліся с..кунды:
«Мы — хутчэйшыя за ўсіх.
Не паспееш "А-а" сказаць —
Нас ужо і не дагнаць!..»
Раз, два, тры!
Раз, два, тры!
Хто дагоніць?
Можа, ты?

*(Мікола Чарняўскі* [1, с. 2]*)*

*Знайдзіце ў вершы займеннікі, вызначыце іх асобу і лік.*

***Апетыт.***

*1. Закрэсліце лішнія літары. Расшыфруйце і запішыце слоўнікавае слова. Пастаўце ў ім націск. Падкрэсліце першы склад перад націскам.*

АЯПЯЕЯТЯЫЯТ

*Утварыце і запішыце форму роднага склону гэтага назоўніка.*

*2. Дапоўніце верш слоўнікавым словам у патрэбнай форме.*

Апетыт

Захварэла наша Рыта,
і не стала ___________.
Просіць раніцаю мама:
— Ты схадзі, сынок, у краму
і купі для нашай Рыты
кілаграмчык ____________.

*(Анатоль Кудласевіч* [2, с. 255]*)*

*3. Прачытайце. Што аб'ядноўвае гэтыя словы?*

Ап..тыт, ап..тытны, ап..тытна.

*Устаўце ў словы прапушчаныя літары.*

*Выдзеліце корань у словах.*

*4. Прачытайце верш. Устаўце прапушчаныя літары.*

Ён — духмяны,
ап..т..тны.
Кожны дзень
яго дамоў
мы нясём
з універсама —
хлеб,
аснову ўсіх асноў.

*(Міхась Пазнякоў* [3, с. 198]*)*

*Знайдзіце ў вершы слова, аднакаранёвае да слоўнікавага. Разбярыце яго па саставе.*

*Знайдзіце дзеяслоў, вызначыце яго час, лік і асобу.*

*5. Разгадайце рэбус. Запішыце слоўнікавае слова, якое атрымалася. Падзяліце яго для пераносу.*




*Дапоўніце гэтым словам прапанаваныя спалучэнні слоў.*

воўчы __________ наганяць __________

| даводзіць да стану моцнага жадання паесці | вялікі, нястрыманы апетыт |
|---|---|

*Злучыце кожны выраз з яго значэннем.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Чарняўскі, М.* Сеў Аўторак у аўто... : для дашк. і мал. шк. узросту / Мікола Чарняўскі ; маст. Я. Ларчанка. — Мінск : Фінансы, улік, аўдыт, 1997. — 23 с.
2. Вясёлка : вершы, апавяданні, казкі, п'есы, песні / уклад. М. А. Маляўка. — Мінск : Маст. літ., 2012. — 279 с., іл.
3. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : Азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / Міхась Пазнякоў ; маст. Марыся Лось. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.


**Крыніцы ілюстрацый:** https://ic.pics.livejournal.com/glebwiktorow/50724117/9447629/9447629_600.jpg; https://png.pngtree.com/element_origin_min_pic/16/12/27/dbe2a491a8b59ed6758f1780d7f02d9b.jpg; http://printonic.ru/uploads/images/2016/03/01/img_56d585dde7832.jpg; http://kuking.net/resize/197/600/w/pictures/section/18/18_890.jpg; https://bumper-stickers.ru/44518-thickbox_default/tigr.jpg.


***Свірыдзенка В. І.****, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.****, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*


# Літаратурнае чытанне. IV клас

## Метадычныя каментарыі да ўрокаў

### Урок 21. Алесь Каско. «Горад з Белаю вежаю»

***Задачы:*** узбагачаць маўленне вучняў лексікай твора; фарміраваць уменне шляхам выбарачнага чытання знаходзіць апісанне герояў, характарызаваць іх па ўчынку; вучыць выказваць уласныя адносіны да зместу твора і вызначаць аўтарскія адносіны да сваіх герояў, фармуляваць галоўную думку; выпрацоўваць уменне падбіраць словы і выразы з тэксту для характарыстыкі персанажа; развіваць літаратурна-творчыя здольнасці вучняў; вучыць аналізаваць прыказкі па тэме, ужываць іх да эпізодаў мастацкіх твораў і герояў, выкарыстоўваць прыказкі ў сваім паўсядзённым жыцці; выхоўваць цікавасць да гістарычнай спадчыны Беларусі.

**Праверка дамашняга задання.**

**Работа з апавяданнем Алеся Каско «Горад з Белаю вежаю».**

***Першасны сінтэз.*** Рубрыка «Узгадайце» на с. 69: міжпрадметныя сувязі з вучэбным курсам «Мая Радзіма — Беларусь»: гутарка пра помнік дойлідства Камянецкую (Белую) вежу. Тут настаўнік можа дапоўніць і канкрэтызаваць выказванні вучняў:

*Помнік быў пабудаваны ў XIII стагоддзі на беразе ракі Лясная. Знаходзіцца ён у горадзе Камянец Брэсцкай вобласці. Камянецкую вежу яшчэ называюць Камянецкім стаўпом ці Белаю вежаю. Апошняя назва лічыцца памылковай, таму што на самай справе вежа змуравана з цаглін цёмна-чырвонага і жаўтаватага колераў. Вышыня вежы дасягае 31 метра. Сама круглая, дыяметрам звыш*